**Працэс акрэдытацыі назіральнікаў**
**кампаніі "Правабаронцы за свабодныя выбары"**
**і пачатак назірання за датэрміновым галасаваннем**

*Інфармацыя па стане на 22.00 4 жніўня 2020 г.*

**Высновы**

– Па стане на 3 жніўня 2020 г., згодна з дадзенымі ЦВК у краіне было акрэдытавана 48 642 назіральнікі, з іх 47 650 на ўчастках для галасавання;

– 68% акрэдытаваных назіральнікаў былі вылучаныя ад грамадскіх аб'яднанняў, большасць з якіх (86,4%) прадстаўленыя шасцю буйнейшымі праўладнымі грамадскімі аб'яднаннямі – БРСМ, "Белая Русь", Саюз жанчын, Саюз ветэранаў, прафсаюзамі, якія ўваходзяць у ФПБ, і Беларускім фондам міра. 62% акрэдытаваных ва УВК назіральнікаў прадстаўляюць дадзеныя арганізацыі, якія традыцыйна прадстаўляюць большасць у складзе УВК;

– па стане на 4 жніўня кампанія "Праваабаронцы за свабодныя выбары" вылучыла 618 назіральнікаў на ўчасткі для галасавання, з якіх 93% было акрэдытавана ва УВК;

– абсалютная большасць назіральнікаў (94,5%) не патрапіла ў квоты назіральнікаў, вызначаных згодна з п.16 Пастановы ЦВК № 15 (са зменамі ўнесенымі пастановай ЦВК № 115 ад 22.07.2020 г. ), паколькі былі акрэдытаваныя пазней, чым першыя тры (пяць) назіральнікаў і не былі дапушчаныя для назірання;

– толькі 34 назіральнікі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" (5,5 % ад агульнай колькасці акрэдытаваных) уключаны ў графікі назірання УВК на пэўны час, які не ахоплівае ўвесь перыяд галасавання і падліку галасоў, а толькі 2 – на працягу ўсяго перыяду выбараў і падліку галасоў;

– большасць дапушчаных на ўчасткі назіральнікаў прадстаўленыя прадзяржаўнымі грамадскімі аб'яднаннямі і былі зарэгістраваныя адразу пасля ўтварэння УВК 24-25 чэрвеня;

– уведзеныя пастановай ЦВК № 115 квоты назіральнікаў на выбарчых участках зрабілі выбарчы працэс цалкам недаступным для незалежнага назірання і нетранспарэнтным. Гэта з'яўляецца парушэннем аднаго з асноўных прынцыпаў правядзення дэмакратычных выбараў – прынцыпа галоснасці. Відавочна, пастанова, якая абмежавала колькасць назіральнікаў, не была скіраваная на прафілактыку

пандэміі, а мела мэтай спыніць незалежнае назіранне: шмат хто з сябраў УВК і праўладных назіральнікаў не выконвае рэкамендацыі Міністэрства аховы здароўя.

**Агульная сітуацыя**

4 жніўня 2020 г. пачалося датэрміновае галасаванне на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якое будзе адбывацца да 8 жніўня ўключна.

Традыцыйна датэрміновае галасаванне падвяргаецца крытыцы як з боку міжнароднай місіій БДІПЧ АБСЕ, так і нацыянальных незалежных назіральнікаў. У сувязі з гэтым перыяд датэрміновага галасавання ўяўляе інтарэс для ажыцяўлення назірання.

Напярэдадні пачатку датэрміновага галасавання назіралася актыўнае вылучэнне назіральнікаў ад розных грамадскіх ініцыятываў, якія ўтварыліся падчас дадзенай выбарчай кампаніі.

Усяго згодна з дадзенымі ЦВК па стане на 03.08.2020 г. выбарчымі камісіямі ўсіх узроўняў было акрэдытавана 48 642 назіральніка, з іх 47 650 на ўчастках для галасавання[1].

Большасць акрэдытаваных назіральнікаў (68%) было вылучана грамадскімі аб’яднаннямі – 33 013 чалавек. З іх большасць (86,4 %) прадстаўленая шасцю найбуйнешымі праўладнымі грамадскімі аб’яднаннямі, якія ж традыцыйна маюць і найбольшае прадстаўніцтва ў складзе выбарчых камісій пры правядзенні выбараў у краіне. Так, ад БРСМ, “Белай Русі”, Саюза жанчын, Саюза ветэранаў, прафсаюзаў, што ўваходзяць у ФПБ і Беларускага фонда міра ў камісіі ўсіх узроўняў было агулам вылучана 30 294 чалавек, што складае 62,3 % ад усіх вылучаных назіральнікаў, з іх 29 580 чалавек ва УВК – 62 % ад агульнай колькасці ўсіх зарэгістраваных ва УВК назіральнікаў.

Згодна з паведамленнямі назіральнікаў кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” большасць з праўладных назіральнікаў былі зарэгістраваныя адразу пасля ўтварэння УВК у чэрвені месяцы і цяпер толькі назіральнікі ад праўладных арганізацый арганізацый і палітычных партый будуць назіраць за выбарамі, якія праводзяцца выбарчымі камісіямі, у якіх прадстаўнікі гэтых жа арганізацый маюць большасць.

Трэба адзначыць, што дадзеныя арганізацыі актыўна вылучаюць назіральнікаў пры правядзенні ўсіх выбараў у Беларусі, аднак ніколі не публікуюць дакладаў аб выніках назірання, не выпрацоўваюць рэкамендацыі па далейшаму ўдасканаленню

[1] http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/stat6.pdf

дзеючага выбарчага заканадаўства. Метадалогія, прынцыпы правядзення назірання гэтымі арганізацыямі таксама не вядомая і публічна не прадстаўленая.

### Прававая аснова

У адпаведнасці з артыкулам 53 ВК, выбаршчык, які не мае магчымасці ў дзень выбараў знаходзіцца па месцы свайго жыхарства, мае права не раней чым за пяць дзён да выбараў ва ўмовах, якія выключаюць кантроль за яго волевыяўленнем, запоўніць у памяшканні ўчастковай камісіі бюлетэнь і апусціць яго ў апячатаную асобную скрыню для галасавання выбаршчыкаў, якія будуць адсутнічаць у дзень правядзення выбараў, рэферэндуму па месцы іх жыхарства. Афіцыйнага пацверджання прычын немагчымасці выбаршчыка, удзельніка рэферэндуму прыйсці ў памяшканне для галасавання ў дзень выбараў, рэферэндуму, не патрабуецца.

Гэтыя правілы перажылі метамарфозу ў свядомасці прадстаўнікоў улады і членаў камісій і цяпер тлумачацца як права любога выбаршчыка прагаласаваць датэрмінова. Такім чынам дадатковы від галасавання па сваім ахопе наблізіўся да галасавання ў асноўны дзень: на папярэдніх выбарах Прэзідэнта 2015 г. датэрмінова прагаласавала 41,3%, а ў асноўны дзень у памяшканні ўчастка для галасавання - 51,6% ад колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Датэрміновае галасаванне ажыццяўляецца з 10 да 14 гадзін і з 16 да 19 гадзін у прысутнасці не менш як двух сябраў участковай камісіі.

У першы дзень датэрміновага галасавання скрыні для галасавання пламбуюцца або апячатваюцца ў прысутнасці членаў камісіі і назіральнікаў.

У перыяд датэрміновага галасавання штодня па заканчэнні часу правядзення галасавання старшыня ці намеснік старшыні ўчастковай камісіі заклейвае прораз для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання лістом паперы. Старшыня або намеснік старшыні і сябра ўчастковай камісіі ставяць подпісы на гэтым лісце. Раскрыццё прорезі для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання робіцца штодзённа перад пачаткам датэрміновага галасавання старшынёй або намеснікам старшыні ўчастковай камісіі. Пры заклейванні і раскрыцці прорезі для апускання бюлетэняў у скрынцы для галасавання маюць права прысутнічаць назіральнікі, замежныя (міжнародныя) назіральнікі, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі. Захоўванне скрыні для галасавання забяспечваецца старшынёй участковай камісіі. Прадпісваецца[2] здаваць пад ахову памяшканні, абсталяваныя ахоўнай сігналізацыяй з вывадам сігналу трывогі на пульт цэнтралізаванага назірання падраздзяленняў

[2] Метадычны дапаможнік для ўчастковых камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які зацверджаны Пастановай ЦВК ад 2020/04/20 № 8, http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/uch_pos.pdf

Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў. Іншых мер па забеспячэнні захаванасці і недатыкальнасці скрыні для галасавання заканадаўствам не прадугледжана. Пры паступленні ад назіральнікаў просьбаў аб дзяжурстве для назірання за скрыняй для галасавання ноччу або падчас дзённага перапынку камісіям загадана растлумачваць ім, "што заканадаўства прадугледжвае назіранне на пасяджэннях камісіі, ходам і вызначэннем вынікаў галасавання. Ахова скрыняў для галасавання ў паўнамоцтвы назіральнікаў не ўваходзіць"[3].

У перыяд датэрмінова галасавання штодня старшыня ці намеснік старшыні ўчастковай камісіі складае пратакол, у якім указваюцца колькасць бюлетэняў, атрыманых участковай камісіяй, колькасць грамадзян, якія атрымалі бюлетэні для галасавання (у апошні дзень датэрміновага галасавання – агульная колькасць грамадзянаў, якія атрымалі бюлетэні для галасавання), колькасць сапсаваных бюлетэняў і колькасць нявыкарыстаных бюлетэняў. Пратакол падпісваецца старшынёй або намеснікам старшыні і сябрам камісіі. Копія пратаколу вывешваецца для ўсеагульнага азнаямлення ў памяшканні ўчастковай камісіі на інфармацыйным стэндзе і захоўваецца на ім да вывешвання копіі наступнага пратаколу. У дзень выбараў на стэндзе захоўваецца копія пратаколу, складзенага і вывешанага ў апошні дзень датэрміновага галасавання.

Датэрміновае галасаванне не праводзіцца на ўчастках для галасавання, утвораных у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама перад другім турам галасавання па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Як ужо адзначалася аналітыкамі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары", 22 ліпеня Цэнтральная камісія прыняла папраўкі[4] ў раней прынятае Палажэнне аб парадку назірання за выбарамі, паводле якіх на выбарчым участку можа прысутнічаць не больш за 5 назіральнікаў (3 – на датэрміновым галасаванні), права прысутнасці якіх на ўчастках для галасавання вызначае чарговасць акрэдытацыі. Паведамленне ЦВК, апублікаванае 27 ліпеня, вызначыла спецыяльны парадак. У адпаведнасці з ім цяпер УВК абмяжоўваюць і размяркоўваюць час, у які дазволена назіраць на ўчастках для галасавання. Асобны графік назірання належыць зрабіць для датэрміновага галасавання (з перапынкам сярод дня на 2 гадзіны) і асобны – для дня выбараў (з 8.00 да 15.00 і з 15.00 да заканчэння падліку галасоў). Важна тое, што прыярытэтная магчымасць выбару даты і часу назірання (найбольш важным назіральнікі лічаць якраз вечаровы час) надаецца адпаведна першым тром і пяці асобам, зарэгістраваным УВК у гэтай якасці.

[3] http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/uch_pos.pdf
[4] http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2020/post115.pdf

Такі парадак выключыў магчымасць незалежнага назірання за галасаваннем і рэалізацыю прама прадугледжаных нацыянальным законам – арт.13 ВК, правоў назіральніка:
- прысутнічаць на пасяджэннях адпаведных камісій;
- прысутнічаць пры пламбаванні або апячатванні скрыняў для галасавання;
- знаходзіцца ў дзень галасавання ў памяшканнях для галасавання з моманту пламбавання ці апячатвання скрыняў для галасавання да сканчэння падвядзення вынікаў галасавання;
- прысутнічаць пры датэрміновым галасаванні, галасаванні па месцы знаходжання грамадзян, правядзенні паўторнага падліку галасоў грамадзян;
- назіраць за выдачай бюлетэняў, ходам галасавання, захаваннем устаноўленага ВК парадку галасавання.

Такім чынам, ЦВК груба парушыла Выбарчы кодэкс, адвольна абмежаваўшы правы назіральнікаў.

## Працэс акрэдытацыі назіральнікаў ад кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Кампанія назірання за выбарамі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" таксама актыўна вылучала назіральнікаў для ажыццяўлення назірання за правядзеннем датэрміновага галасавання. Вылучэнне ажыцяўлялася ад грамадскага аб'яднання Таварыства беларускай мовы ім. Францыска Скарыны, якое далучылася да кампаніі, РПГА "БХК" і шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў. Усяго на момант пачатку першага дня датэрміновага галасавання было вылучана 618 назіральнікаў.

Большасць назіральнікаў (93 %) паведамілі, што не мелі цяжкасцяў і праблем пры акрэдытацыі на ўчастках для галасавання.

Некалькім назіральнікам кампаніі было адмоўлена ў акрэдытацыі, ці яны не змаглі яе атрымаць у сувязі з адсутнасю на месцы сябраў УВК. У сувязі з гэтым былі пададзеныя адпаведныя скаргі ў вышэйстаячыя ТВК.

Аднак пры гэтым большасць з акрэдытаваных назіральнікаў (94,5%) не здолелі патрапіць на ўчасткі для галасавання для ажыцяўлення назірання, паколькі былі акрэдытаваныя ў асноўным за нумарамі 10, 15, 20 і адпаведна не траплялі ў квоты вызначаныя пастановай № 115 ЦВК.

Назіральнікі Аляксей Горбач і Марына Шастоўская былі акрэдытаваныя на мінскім выбарчым участку № 15 Партызанскага р-на г. Мінска, размешчанага ў сярэдняй школе № 108. 24 ліпеня сакратар камісіі Святаслаў Зубкевіч зарэгістраваў у кнізе акрэдытацыі назіральнікаў – Марыну пад першым нумарам, а Аляксея пад трэцім. Аднак ужо 3 жніўня перад пачаткам датэрміновага галасавання назіральнікам

паведамілі з УВК, што адбылася памылка і іх чарга на назіранне пасунулася на 12 чалавек[5].

Толькі 34 назіральнікі кампаніі (5,5% ад агульнай колькасці акрэдытаваных) уключаныя ў графікі назірання УВК на пэўны час, які не ахоплівае ўвесь перыяд галасавання і падліку галасоў, а 2 – могуць назіраць увесь перыяд галасавання і за падлікам галасоў.




У большасці выпадкаў назіральнікам кампаніі пад рознымі падставамі адмаўлялі ў азнаямленні з журналамі акрэдытацыі назіральнікаў і такім чынам не прадстаўлялі інфармацыі аб усіх акрэдытаваных назіральніках на ўчастках: дату іх акрэдытацыі ва УВК, суб’ектаў ад якіх яны былі накіраваныя і інш.

[5] https://elections2020.spring96.org/be/news/98655




**Першы дзень назірання**

Нягледзячы на тое, што толькі нязначная частка назіральнікаў атрымала магчымасць весці назіранне, тыя з назіральнікаў, хто быў дапушчаны да часовага ўдзелу ў назіранні, і тыя, хто правёў на ўчастку некаторы час, паспелі адзначыць шэраг парушэнняў, якія ўплываюць на правы выбаршчыкаў.

Сярод адзначаных парушэнняў – невыкананне патрабаванняў ЦВК аб выкананні рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя па пытаннях прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі, пра што заявілі больш за 70 назіральнікаў: яны адзначылі адсутнасць масак, сацыяльнай дыстанцыі, антысэптыка, аднаразовых пальчатак ды іншыя абставіны.

У прыватнасці, адна з назіральніц на ўчастку для галасавання № 64 у Маскоўскім раёне г.Мінска часта і моцна кашляла. На вусную просьбу назіральніка кампаніі яе выдаліць участковая камісія адказала адмовай, спаслаўшыся на немагчымасць патрабаваць у кожнага назіральніка даведку аб стане здароўя. Сябры камісіі самі пры гэтым не прытрымліваліся рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя.

Адзначаліся назіральнікамі адсутнасць "ўваходных" шторак на кабінах для галасавання, што на іх думку парушала тайну галасавання, няёмкае размяшчэнне месцаў для назіральнікаў адносна скрыні для галасавання.

Некалькім назіральнікам (у Мінску і ў Гомелі), якія не знаходзіліся на ўчастку на момант заканчэння галасавання, адмовілі ў азнаямленні з пратаколам аб ходзе датэрміновага галасавання. Так, на ўчастку для галасавання №52 у Фрунзенскім раёне г.Мінска назіральніку, які ў 18.57 звярнуўся у камісію, сябра камісіі параіла

пачакаць і зачыніла перад ім дзверы. А ў 19.03 супрацоўнік МУС загадаў сысці, паведаміўшы, што камісія разыйшлася па дамах.

Варта адзначыць, што абмежаванне права назіральнікаў азнаёміцца з пратаколам з’яўляецца незаконным і супярэчыць нават пастанове аб накіраванні назіральнікаў (са зменамі), бо гэта ніякім чынам не ўплывае на меры бяспекі ва ўмовах пандэміі.

Тымі з назіральнікаў, хто ажыццяўляў падлік яўкі выбаршчыкаў, адзначаюцца выпадкі сур’ёзнага несупадзення колькасці прагаласаваўшых па іх дадзеных і па дадзеных камісій. Так на участках для галасавання №4 і 5 у Савецкім раёне г.Мінска, размешчаных у адным будынку, сумарная розніца склала 120 выбаршчыкаў – на столькі, па паведамленні назіральніка, завышаная яўка ў першы ж дзень назірання. Паведамленне аб значным несупадзенні колькасці выбаршчыкаў паступіла таксама з участка №36 у Першамайскім раёне г.Мінска.

Назіральнік у УВК на ўчастку для галасавання №108 Кастрычніцкага раёну г. Гродна адзначыў, што акрамя сябраў камісіі яшчэ шэсць назіральнікаў, акрэдытаваных на ўчастку з’яўляюцца настаўнікамі адной школы. Тая ж сітуацыя і на ўчастку для галасавання № 40 Першамайскага раёна г.Віцебска. У цэлым, сябры камісій часта не знаёмяць назіральнікаў кампаніі з журналам акрэдытацыі, а назіральнікі ад праўладных суб'ектаў захоўваюць у таямніцы ад назіральнікаў кампаніі, кім яны вылучаны на ўчастак. Мабыць, некаторыя з іх самі няцвёрда гэта ведаюць: напрыклад, на просьбу паведаміць, кім яна вылучана, адна з назіральнікаў на ўчастку №18 Ленінскага раёна г. Брэста адказала: “Прафсаюзам”. На ўдакладняючае пытанне: якім менавіта, адказала – “БРСМ”.